Справядлівасць, роўнасць, міласэрнасць!

Беларускі Усход

МІЖРАЕННАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

● Заснавана ў 1991 годзе ● № 25 (26) СУБОТА, 19 верасня 1992 г.

ЧАГО ХОЧА НАРОДНЫ ФРОНТ?

За гады існавання савецкай улады (1917-1985 г.г.) накопліваліся вялікія групы супярэчнасцей.

Да першай групы адносяцца супярэчнасці паміж закасцянелымі дзяржаўна-бюракратычнымі адносінамі і творчымі дэмакратычнымі сіламі, якія тайна вялі ідэалагічную барацьбу з перарадзіўшайся кампартыяй. Другая група прадугледжвае супярэчнасці паміж дзяржаўна-бюракратычнымі адносінамі і ініцыятыўнымі эканамічнымі сіламі, да якіх мы можам аднесці як прадпрыймальнікаў, прадстаўнікоў бізнесу, нават дзеячаў «чорнага рынку», якіх можна было назваць «неакапіталістамі».

Гэтыя дзве ініцыятыўныя сілы былі адзінымі ў нянавісці да таталітарнага рэжыму. Зразумела, што з пачаткам перабудовы ўсе гэтыя сілы аб'ядналіся для барацьбы з каманднa-адміністратыўнай сістэмай. Так фарміраваўся і антытаталітарны блок Беларусі БНФ «Адраджэньне».

БНФ — гэта не партыя. Гэта палітычны рух, у якім праследжваюцца пэўныя рысы патэнцыяльных партый. У яго склад уваходзяць як правыя, так і левыя сілы. У сваёй дзейнасці БНФ абапіраецца на тры асноўныя прынцыпы: дэмакратыя, адраджэнне і ненасілле. Дэмакратыя прадугледжвае шматпартыйнасць, палітычныя свабоды, сацыяльную абароненасць.

Гэтыя задачы мы можам выканаць, абапіраючыся на другі прынцып. Рэалізацыя прынцыпу адраджэння патрабуе сапраўднага суверэнітэту краіны, узмацнення на новай ступені беларускай культуры і мовы.

Рэалізацыі грамадска-палітычных мэтаў мы можам дасягнуць на аснове трэцяга прынцыпу — ненасілля.

Я — сацыял-дэмакрат, але мне важна, каб наша ідэалогія сцвярджала сябе не шляхам фізічнага знішчэння носьбітаў другіх ідэалогій, а шляхам духоўнай перамогі.

Ідэолагі БНФ імкнуцца рашаць задачы беларускага адраджэння толькі праз духоўнае, праз паглыбленне сваёй нацыянальнай душы, лічачы гэты шлях найбольш перспектыўным. Галоўнай формай нашай дзейнасці з'яўляецца палітычная барацьба, імкненне ўзяць уладу. Нас папракаюць у гэтым: «Да ўлады імкнецеся!» А хто не імкнецца да яе? Камуністы? Дык яны ж і так ва ўладзе. А як інакш мы зможам даказаць перавагу нашай палітычнай платформы, калі не ўзяўшы ўладу?

У цывілізаваным сусвеце аб гэтым заяўляюць адкрыта. А нам чаго саромецца?

Зусім ненавуковымі, да жаху вульгарнымі з'яўляюцца словы: «Дзе ж вы раней былі?» Для адукаванага чалавека гэта відавочна. Ленін жа выйшаў з падполля толькі ў лістападзе 1917 г, а не раней. Гарбачоў сфарміраваў свае прынцыпы перабудовы толькі стаўшы Генсекам. Марат і Рабасп'ер змаглі заявіць аб сабе толькі пасля падзей 1798 года.

Заўжды існуюць перадумовы, з якіх вырастаюць потым вялікія падзеі, якасныя пераўтварэнні. Сябры БНФ не нарадзіліся на голым месцы, яны былі падрыхтаваны да ўдзелу ў палітыцы самім жыццём, жыццёвай эвалюцыяй. БНФ «Адраджэньне» — часовая з'ява, якая хутка гістарычна вычарпае сябе. З поўнай перамогай над каманднa-адміністратыўнай сістэмай і ўмацаваннем новых партый, гістарычныя мэты БНФ можна лічыць выкананымі. Бліжэйшыя задачы БНФ «Адраджэньне» я бачу ў тым, каб даць магчымасць узрасці і ўзмацніцца новым партыям.

Я сацыял-дэмакрат і мне вельмі важна, каб не паўтарыліся часіны бальшавікоў. Нам важна, каб ідэалогіі сцвярджалі сябе не шляхам рэпрэсій да носьбітаў другіх светапоглядаў, а толькі хутчэйшым вырашэннем жыццёвых праблем. А для гэтага трэба даць роўныя юрыдычныя правы носьбітам усіх існуючых ідэалогій, што магчыма пры існаванні шматпартыйнасці.

Алесь СЕРДЗЮКОЎ,
рэдактар газеты «Ратуша»,
г. Магілёў.

НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ.

● ХОЦІМСК

Земляробы калгаса «Перамога» заканчваюць сяўбу азімых і адначасова хуткімі тэмпамі ўбіраюць бульбу. Сёлета яе было пасаджана 130 гектараў. Нягледзячы на надзвычай сухое лета ўраджай хоць і невялікі, а ўсёж цярпімы — 100-120 цэнтнераў з гектара.

— А думалася, што і палавіны гэтага не будзе, — гавораць калгаснікі.

(Наш кар.).

● КРЫЧАЎ

Першыя 16 заяў грамадзян па прыватызацыі жылля разгледжаны на пасяджэнні гарвыканкама. Па іх прыняты станоўчыя рашэнні. Заяўнікі надзелены жыллёвай квотай якая склала ад 3 да 15 тысяч рублёў (у залежнасці ад працоўнага стажу). Тыя, ў каго квота перавышае вартасць займаемай кватэры, атрымаюць на астатнюю суму чэк, а ў каго яна будзе менш — даплоцяць розніцу грашыма са сваёй кішэні.

А. БАЛДОЎСКІ.

● ГОРКІ
У БСГА — НОВЫ РЭКТАР

Нядаўна на пасяджэнні вучонага савета Беларускай Сельскагаспадарчай акадэміі новым рэктарам гэтай старэйшай ВНУ краіны выбраны Вячаслаў Аляксеевіч Шаршуноў, які раней працаваў у БСГА загадчыкам кафедры механізацыі жывёлагадоўлі і электрафікацыі сельскай гаспадаркі. Шаршуноў В. А. нарадзіўся ў 1949 годзе. Мае вучоную ступень доктара тэхнічных навук, прафесар, член-карэспандэнт акадэміі аграрных навук Беларусі.

У рабоце вучонага савета прыняў удзел міністр сельскай гаспадаркі і харчавання рэспублікі Беларусь Ф. У. Мірачыцкі.

Л. ВАСІЛЬЕВА.

СОЙМ БНФ

11 верасня ў Менску адбылася нарада ініцыятыўнай групы па правядзенню рэферэндума, на якой абмеркавана сітуацыя, што склалася зараз у палітычных кругах Беларусі. Намечаны шляхі далейшых дзеянняў.

Затым прайшло пасяджэнне Сойма БНФ, які абмеркаваў шэраг актуальных пытанняў. Заслухана некалькі дакладаў і паведамленняў.

Галоўным было пытанне аб рэферэндуме. Па гэтаму пытанню прынята рэзалюцыя, якую мы і змяшчаем.

РЭЗАЛЮЦЫЯ СОЙМУ БНФ

«Прыярытэтныя кірункі палітыкі БНФ падчас падрыхтоўкі да рэферэндуму».

Сойм БНФ «Адраджэньне» разгледзеў задачы ўнутранай і міжнароднай палітыкі на перыяд падрыхтоўкі да рэферэндуму і прыйшоў да наступных высноваў:

1. Палітычнае становішча ў Беларусі характарызуецца своеасаблівасцю: відаць выразны падзел паміж былой камуністычнай наменклатурай, якая з'яўляецца пасутнасцці партыяй улады, і настроеным апазіцыйна да наменклатуры грамадствам.

Дэмакратычныя сілы, прадстаўленыя народным фронтам і дэмакратычнымі партыямі, фактычна адлюстроўваюць інтарэсы большасці народу і маюць досыць грамадскай падтрымкі, каб прывесці краіну да незваротных дэмакратычных зменаў. Пры гэтым Беларусь першаю сярод былых савецкіх краінаў мае шанц прыйсці да дэмакратыі мірным канстытуцыйным шляхам, захаваўшы грамадскі спакой. Аднак «партыя ўлады», якую складае згуртаваная вакол Саўміну, Саветаў і Выканкамаў былая партнаменклатура, ігнаруе, у парушэнне закону, волю амаль паўмільёна грамадзян Беларусі да рэферэндуму і новых выбараў.

Ад вырашэння гэтага канфлікту ў значнай ступені залежыць будучыня, спосабы і тэмпы дэмакратычных пераўтварэнняў ва усім Усходне-Еўрапейскім рэгіёне.

2. У гэтай сітуацыі БНФ будзе дамагацца правядзення рэферэндуму і новых выбараў, як галоўнай і неабходнай умовы ўсіх эканамічных, палітычных, культурных пераўтварэнняў.

Рэферэндум — прыяпрытэт палітычнай дзейнасці БНФ на бліжэйшую перспектыву.

3. БНФ імкнецца выкарыстоўваць аўтарытэт і уплыў сусветнае дэмакратычна-грамадскае думкі, дэмакратычных партый і арганізацый іншых краінаў, забяспечваць магчымасць міжнароднага кантролю за сітуацыяй вакол рэферэндума ў Беларусі.

4. БНФ імкнецца да стварэння і ўмацавання блоку дэмакратычных сілаў Беларусі, каб мець гарантаваную перспектыву прынамсі на час паўнамоцтваў першага дэмакратычна выбранага парламенту.

г.МЕНСК.
11 верасня 1992 г.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА


на газету «Беларускі Усход» на чацверты квартал гэтага і на першае паўгоддзе 1993 года.

1 месяц — 9 рублёў, тры месяцы — 27 рублёў, на 6 месяцаў — 54 рублі.

А ў розніцу купляць газету абыдзецца даражэй. У кіёсках Саюздруку і ў аддзяленнях сувязі газета з першага кастрычніка будзе каштаваць 3 рублі за адзін экзэмпляр, што за паўгоддзе складзе 78 рублёў — на 24 рублі больш, чым па падпісцы. Так што выгадней падпісацца на «Беларускі Усход». У газеце Вы знойдзеце праграму тэлерадыёперадач, розную інфармацыю як з раёнаў Беларускага Усходу, так і з краін СНД і ўсяго свету, карысныя парады гаспадыням, адказы на пытанні, якія Вы дашлеце ў рэдакцыю, творы мясцовых паэтаў празаікаў і мастакоў, анекдоты, іншыя паведамленні і публікацыі.

Выпісвайце і чытайце «БЕЛАРУСКІ УСХОД»!

РЭДАКЦЫЯ.



БУДУЦЬ З БУЛЬБАЧКАЙ

У Клімавіцкай МПМК-256 не спадзяюцца на нейкага добрага дзядзьку, а самі аб сабе клапоцяцца. У саўгасе «Малашкавічы» будаўнікі пасадзілі па вясне 40 гектараў бульбы і пасеялі 25 гектараў зерневых. Сваімі сіламі, сваёй тэхнікай, са сваім угнаеннем і насеннем.

Відаць — жыццё прымусіла. У свой час тут набылі бульбасаджалку, дзве бульбакапалкі, два раскідвальнікі угнаенняў і зернявую сеялку. Калі надышла пара — распрацавалі поле, садзілі, апрацоўвалі бульбяны і збожжавы палеткі свае ж механізатары — Уладзімір Пятровіч Лосеў, Анатоль Уладзіміравіч Швяцоў, Мікалай Фёдаравіч Мартынаў, Мікалай Цімафеевіч Мартынаў і іншыя.

— А цяпер пабрыгадна, па графіку будзем убіраць, — не без гонару кажа старшыня прафсаюзнага камітэта Уладзімір Дзмітравіч Напрэенка.

Працаўнікі калоны ўнеслі ў касу толькі сімвалічную плату — 15 рублёў за сотку. Астатнія выдаткі ўзяла на сябе МПМК. На атруту для каларадскага жука пайшло 10700 рублёў. Ды 67 тысяч рублёў выплацілі райсельгасхіміі за ўгнаенні.

Затое тут будуць з бульбачкай. Што адметна — выдзяляюць клубні і для пенсіянераў! Чым не вопыт, варты пераймання іншымі арганізацыямі? І не толькі Клімавіцкага раёна...

Іван ЛАПО,
супрацоўнік клімавіцкай райгазеты «Родная ніва».

Саўгас «Асмолавічы» Клімавіцкага раёна славіцца багатымі ўраджаямі садавіны і агародніны. Нават у сёлетнюю спёку тут расце нядрэнны ўраджай капусты.

НА ЗДЫМКУ: галоўны аграном райсельгасупраўлення І.Я.Свідзерскі з брыгадзірам агароднінаводчай брыгады Н.П.Купцовай.

Фота І.ГУЛЕВІЧА.

З праграмнай заявы БНФ «Адраджэньне»

• СВАБОДА • НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ • АДРАДЖЭНЬНЕ •

Галоўная мэта Беларускага Народнага фронту «Адраджэньне» — вольны чалавек у адроджанай незалежнай Беларусі.

Наш палітычны ідэал — свабоднае грамадства і прававая дзяржава, дэмакратычны лад.

БНФ імкнецца да стварэння грамадства, дзе прызнаецца абсалютны характар універсальных правоў чалавека, дзе прыватнае жыццё асобы — недатыкальнае. Прынцып самаарганізацыі такога грамадства — не чалавек для дзяржавы, але дзяржава для чалавека.

Крыніцаю ўлады ў дзяржаве павінен быць народ: ніякі грамадзянін, або палітычныя арганізацыя не маюць пераважнага права на ўладу.

Ад злоўжывання уладаю грамадства ахавана падзелам яе на тры незалежня галіны: заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

Эканамічнай базаю палітычнай дэмакратыі ёсць эканамічная свабода — права кожнага чалавека валодаць уласнасцю і распараджацца ёю. У прававой дзяржаве кожнаму грамадзяніну гарантуецца святое права недатыкальнасці уласнасці. Без гэтага дзяржава, або пануючая партыя, ў аднachacсе могуць адабраць у чалавека ўсё.

Свабода асобы і дэмакратычнае грамадства рэалізуюцца толькі ў незалежнай дзяржаве.

Народ павінен сам распарвджацца сваі лёсам, выбіраць форму дзяржаўнага кіравання і ўладу.

Беларускі народ заваяваў і выпакутаваў права на дзяржаўную незалежнасць усім сваім гістарычным шляхам. Дзяржаўнасць Беларусі ўвасаблялася ў Полацкім Княстве, у Вялікім Княстве Літоўскім з яго традыцыямі прававой дзяржавы і цярпімасці. Воля Беларусі выявілася ў паўстаннях супраць Расійскай імперыі ў XIX стагоддзі, у рэвалюцыйных выступленнях у 1905 і 1917 гадах. Правамоцным выразам імкнення да незалежнасці дзяржавы стала абвяшчэнне 25 **сакавіка 1918 года** Радаю Усебеларускага З'езду Беларускай Народнай Рэспублікі.

Існаванне БНР было спынена ўзброенай сілаю. Аднак бальшавікі вымушаны былі дазволіць стварэнне ў 1919 годзе БССР, якая незалежна ад іхняга жадання аказалася пераемніцаю дзяржаўнай традыцыі Беларусі.

Беларусь мае гістарычныя, юрыдычныя і маральныя падставы аднавіцца як незалежная дзяржава — Рэспубліка Беларусь.

Будучая незалежная Беларусь — гэта дзяржава, якая праз стагоддзі каланіяльнага заняпаду вернецца ў сям'ю еўрапейскіх народаў, як роўная сярод роўных, і адновіць свае маральныя, культурныя, сацыяльныя каштоўнасці.

На Беларусі не будзе ўзброеных сіл іншых краін. Незалежная Беларусь стане без'ядзернаю дзяржаваю.

Беларуская дзяржава будзе заключаць палітычныя, эканамічныя ды іншыя пагадненні, зыходзячы з інтарэсаў народу Беларусі.

Незалежная дэмакратычная Беларусь зможа стварыць сістэму дзейнаснай сацыяльнай абароны для тых, хто з аб'ектыўных прычын не ў стане пракарміць сям'ю.

Незалежная дэмакратычная Беларусь будзе дбаць пра сям'ю, як пра апору грамадства і нацыі, пра захаванне маральна-этычных традыцый народу, пра фізічнае здароўе сваіх грамадзян.

Незалежная дэмакратычная Беларусь будзе гарантам развіцця і росквіту Беларускай мовы і культуры.

Вольны народ, сам распараджаючыся плёнам сваёй працы, маючы міжнародную падтрымку, сам наладзіць гаспадарку, адродзіць культуту — сам выратуе сябе.

Беларусь павінна праводзіць самастойную знешнюю палітыку, выкарыстоўваць свой статус краіны-заснавальніка ААН для ўмацавання незалежнасці, выхаду з гаспадарчага крызісу, дзеля арганізацыі і каардынацыйнай дапамогі Рэспубліцы — ахвяры Чарнобыльскай катастрофы.

БНФ лічыць, што ў перыяд пераходу да незалежнасці найвышэйную дзяржаўную Уладу ў Рэспубліцы ажыццяўляе яе Вярхоўны Савет, рыхтуюцца умовы для правядзення выбараў ва Усебеларускі Устаноўчы Сойм, які вызначыць надалей форму дзяржаўнай Улады і дзяржаўнага кіравання Беларусі.

Неабходна прыняць новую Канстытуцыю Беларусі, распрацаваную на падставе Дэкларацыі аб суверэнітэце і міжнародных дакументаў аб правах чалавека і прывесці законадаўства у адпаведнасць з гэтымі прынцыпамі.

БНФ выступае за каардынацыю дэмакратычных і незалежных сіл Беларусі ў падрыхтоўцы і правядзенні выбараў ва Устаноўчы Сойм, якія павінны прайсці на шматпартыйнай аснове.

Дзяржаўна-манапалістычная эканоміка няздольна забяспечыць дабрабыт народу, напоўніць рынак таварамі. Гэтая эканомічная сістэма вычарпала сябе, яна перажывае глыбокі крызіс, які пераходзіць у катастрофу. Адзіны паратунак — перавод эканомікі на рынкавыя адносіны, забеспячэнне прыярытэту прыватнай уласнасці. Доля дзяржаўнай уласнасці павінна быць дастатковай для рэгулявання эканамічных працэсаў.

Наменклатурная каста запалохвае народ рынкам і ў той жа час, выкарыстоўваючы сваё прывілеяванае становішча, манапольна прыватызуе дзяржаўную маёмасць, каб змяніць юрыдычную уладу над народам на фінансавую. Такі варыянт прыватызацыі вядзе да паглыблення сацыяльнай несправядлівасці, пагражае сацыяльным выбухам. БНФ выступае за вяртанне адпаведнае долі агульнанароднай уласнасці кожнаму грамадзяніну Беларусі, за роўныя магчымасці пры ўваходзе ў рынкавыя адносіны.

Частка маёмасці мусіць застацца ў дзяржаўнай уласнасьці для выкарыстання Урадам рэспублікі ў стратэгічных агульнародных мэтах.

БНФ выступае за хутчэйшае ўвядзенне беларускай грашовай адзінкі (талера).

На думку БНФ шлях да эканамічнага суверэнітэту мае на ўвазе падатковую рэформу. Узровень падаткаў не павінен стрымліваць прадпрымальніцкую дзейнасць і рост вытворчасці.

БНФ — за індэксацыю выплат пенсіянерам, студэнтам, інвалідам, шматдзетным, тым, хто знаходзіцца на дзяржаўнай службе.

БНФ выступае за ліквідацыю сістэмы наменклатуры і ўсіх прывілей. БНФ — за сацыяльныя гарантыі для найменш забяспечаных грамадзян, за ільготы для інвалідаў, пенсіянераў і шматдзетных.

БНФ «Адраджэнне» лічыць, што Беларусь мае права на кампенсацыю страт ад Чарнобылю і павінна дамагацца яе міжнародна прызнаным чынам.

БНФ патрабуе спыніць вытворчасць харчовых прадуктаў на заражаных тэрыторыях.

Толькі свабодны, культурны, скансалідаваны народ, а не паднявольнае, запалоханае, раз'яднанае насельніцтва здольны ствараць і развівацца. Перадумовы кансалідацыі і выжывання беларускай нацыі — гэта адраджэнне яе культуры.

БНФ сцвярджае, што Беларусь можа вярнуцца ў Еўрапейскую і сусветную супольнасць народаў толькі праз адраджэнне шматвяковых культурных і навуковых традыцый.

БНФ выступае за свабоду веравызнання і рэлігійнай дзейнасці ў Рэспубліцы, за роўнасць канфесій, за аддзяленне атэістычнай прапаганды ад дзяржавы.

Галоўнае багацце нашае Бацькаўшчыны — яе народ. Жыве народ — жыве Беларусь.

24 сакавіка 1991 года
г. Менск.

Мы пазнаёмілі чытачоў «Беларускага Усходу» з важнейшымі палажэннямі праграмнай заявы БНФ «Адраджэньне» прынятай другім з'ездам Фронту. Больш падрабязна з гэтай заявай вы можаце пазнаёміцца ў Суполках Сяброў Беларускага Народнага Фронту або ў раённых (тэрытарыяльных) Радах (аддзелах) БНФ. Але, на наш погляд, каб зразумець імкненні і палітычную платформу гэтага руху, дастаткова і надрукаванага, калі ўважліва прачытаць.

СТАТУТ

Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне»

(АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ)

Беларускі Народны Фронт «Адраджэньне» — гэта шырокі грамадска-палітычны рух за пераўтварэнне грамадства і адраджэнне беларускай нацыі на прынцыпах дэмакратыі і гуманізму, развіцця культуры карэннай нацыянальнасці і ўсіх нацыянальных супольніцтваў на Беларусі.

Галоўная мэта БНФ — усталяванне дэмакратычнага грамадства, дасягненне незалежнасці Беларусі. БНФ дзейнічае ў межах Канстытуцыі і Законаў РБ, у адпаведнасці з палажэннямі Праграмнай Заявы і Статутам.

ДЗЕЙНАСЦЬ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

БНФ супрацоўнічае з грамадскімі арганізацыямі і дзяржаўнымі ўстановамі ў ажыццяўленні планаў і праграм, адпаведных мэтам і задачам БНФ.

БНФ удзельнічае ў выбарчых кампаніях: вылучае сваіх кандыдатаў у дэпутаты і падтрымлівае іншых кандыдатаў, якія стаяць на дэмакратычнай платформе, выпрацоўвае наказы дэпутатам, дапамагае ім у дзейнасці, ставіць пытанні аб адкліканні дэпутатаў, што не апраўдалі даверу выбаршчыкаў, бярэ ўдзел у грамадскім кантролі за ходам выбарчых кампаніяў.

БНФ выступае супраць насілля і не адказвае насіллем на яго ўжыванне уладамі.

УДЗЕЛ У БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

У руху БНФ «Адраджэньне» аб'ядноўваюцца грамадзяне, грамадскі суполкі, аб'яднанні, партыі, што падтрымліваюць палажэнні Праграмнай заявы БНФ і прызнаюць яго Статут.

Прыхільнікі БНФ робяцца яго сябрамі, калі яны ўваходзяць у склад аднае з суполак БНФ.

Сябрамі БНФ могуць быць грамадзяне, якія дасягнулі 18 гадовага ўзросту, падзяляюць яго Статут, падтрымліваюць палажэнні Праграмнай Заявы БНФ незалежна ад нацыянальнасці, партыйнасці, веравызнання і сацыяльнага становішча.

Сябры БНФ карыстаюцца правамі:

— Свабодна ўдзельнічаць у мерапрыемствах Фронту;

— арганізоўваюць мерапрыемствы БНФ у адпаведнасці з яго Статутам і Праграмнай заявай;

— Выбіраць і быць выбранымі ў кіраўнічыя органы БНФ;

— Вольна выходзіць з БНФ.

СЯБРЫ БНФ АБАВЯЗАНЫ:

— Рэгулярна выплочваць грашовыя складкі ў памерах, якія вызначаюць суполкі;

— Распаўсюджваць і спрыяць распаўсюджванню друкаваных выданняў БНФ;

Аснову БНФ складаюць суполкі (не менш трох чалавек), якія складаюцца на месцы працы, вучобы, службы ці жыхарства людзьмі, з'яднанымі грамадзянскай свядомасцю ды абавязкам, агульнасцю маральна-этычных паставаў.

Суполкі могуць мець свае планы дзейнасці, якія павінны адпавядаць асноўным ідэям і прынцыпам палажэнняў Праграмнай заявы і Статута БНФ.

У суполцы складаецца спіс яе сяброў, афармляюцца ўліковыя карткі. Сябрам суполкі выдаюцца асабістыя пасведчанні.

Новыя сябры прымаюцца ў склад суполкі па пісьмовай заяве на агульным сходзе суполкі простай большасцю галасоў.

Сябра БНФ можа быць выключаны з БНФ на рашэнні суполкі, калі ён груба парушае Статут ці ганьбіць годнасць сябра БНФ. Гэта рашэнне можа быць абскарджана ў вышэйшым выбарным органе БНФ.

Раённыя, гарадскія, рэгіянальныя Рады БНФ рэгіструюцца ва Управе БНФ.

Суполка рэгіструецца ў раённай, гарадской, рэгіянальнай Радзе БНФ на падставе заявы і пратаколу яе арганізацыйнага сходу.

Калі ў раёне, горадзе, рэгіёне няма Рады БНФ, яна рэгіструецца непасрэдна ўправаю БНФ «Анраджэньне».

Суполкі трымаюць сталую сувязь з Управаю, рэгулярна праводзяць пасяджэнні, абмяркоўваюць дакументы фронту.

Суполка БНФ выбірае скарбніка, можа ствараць рэвізійную камісію і г.д. Суполка БНФ пералічвае не менш 10% ад сумы асабістых складак сяброў суполкі і збораў з падпісных лістоў.

Суполка вылучае прадстаўнікоў у кіруючыя органы БНФ і можа іх адклікаць.

Суполкі могуць ствараць раённую, рэгіянальную Раду (аддзел, арганізацыю) БНФ, вылучыўшы туды упаўнаважаных, выбраць кіраўніка Рады, скарбніка і рэвізійную камісію.

Акрамя суполак БНФ у тэрытарыяльныя Рады БНФ на аднолькавых правах з суполкамі могуц уваходзіць іншыя арганізацыі (прафесійныя, экалагічныя, асветныя, палітычныя і г.д. арганізацыі ды партыі), якія ўваходзяць у БНФ і калі іх Статуты і Праграмы не супярэчаць Статуту БНФ і асноўным палажэнням Праграмнай заявы БНФ.

Партыі і арганізацыі пералічваюць у распараджэнне Управы БНФ не менш за 10% ад сумы асабістых складак сваіх сяброў.

КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

Усе кіраўнічыя органы БНФ з'яўляюцца выбарнымі. Кіраўнічымі органамі БНФ з'яўляюцца Сойм і З'езд. Выканаўчым органам БНФ ёсць Управа БНФ.

З'езд збіраецца не радзей аднаго разу ў два гады. Дэлегаты з'езду абіраюцца з прадстаўнікоў суполак і іншых грамадскіх арганізацый і партый, што ўваходзяць у БНФ.

З'езд БНФ прымае рашэнні пра стварэнне БНФ і яго ліквідацыю, прымае Статут, Праграму, уносіць у іх змяненні і дапаўненні, прымае неабходныя рашэнні, зацвярджае рэдактараў друкаваных органаў БНФ, выбірае на 2 гады Сойм, старшыню Фронту ды яго Намесніка, рэвізійную камісію.

Сойм БНФ працуе ў прамежках паміж з'ездамі, фармуе Склад Управы. Сойм склікаецца не радзей як штомесяц.

Сойм БНФ пры неабходнасці склікае паміж з'ездамі Канферэнцыі БНФ.

Управа — стала дзейным органам БНФ, збіраецца на пасяджэнні не радзей аднаго разу на тыдзень.

Управа БНФ кіруе дзейнасцю БНФ у межах нададзеных ёй паўнамоцтваў, распараджаецца сродкамі БНФ у адпаведнасці з рашэннямі Сойму БНФ.

Рэвізійная камісія БНФ падсправаздачна толькі З'езду.

Скарбнік БНФ і штатны персанал прызнаюцца Управаю. Управа БНФ знаходзіцца ў Менску.

МАЁМАСЦЬ І ФІНАНСЫ

БНФ, яго тэрытарыяльныя Рады, Суполкі, Аддзелы валодаюць правам юрыдычнай асобы. БНФ мае сваю маёмасць і фінансавыя сродкі, якія захоўваюцца на бягучых банкаўскіх рахунках, у тым ліку ў замежнай валюце.

Грашовыя сродкі БНФ складаюцца:

— з добраахвотных ахвяраванняў і пералічэнняў ад удзельнікаў БНФ, арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, кааператураў, прыватных асоб у Беларусі;

— З грашовых складкаў сяброў БНФ;

— З даходаў ад масавых мерапрыемстваў, арганізаваных БНФ і іншых паступленняў.

Сродкі БНФ выдаткоўваюцца:

— на выданне і распаўсюджванне літаратуры БНФ;

— на арэнду памяшканняў, набыццё неабходнай маёмасці;

— на камандзіровачныя выдаткі;

— на вядзенне выбарчых кампаніяў;

— на іншыя патрэбы.

Сойм, Управа БНФ і тэрытарыяльныя рады, Аддзелы маюць пячаткі са сваёй назваю і эмблемаю «Адраджэньне».

Таленты нашага краю

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ СТАРОНКА


ЗНАЁМЦЕСЯ! ЧЛЕНЫ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА АБ'ЯДНАННЯ «ТАЛЕНТЫ НАШАГА КРАЮ».

ТРИФОН ЛИСТОПАДОВ

ПОКАЯНИЕ ГРЕШНИКА

(поэма)

Он был страшней разбойника лесного,
Родных детей терзая и жену,
Все пропивал, все бил, а утром снова
В противной злобе тешил сатану.
Он был замызганный по шею
И весь испачкан до ушей,
Ни совести, ни уваженья,
Об этом нету и речей.
Он был причиною инфекций разных,
Всегда творил бесстыдные дела,
Валялся он на тротуарах грязных,
Жульем раздетый догола.
Нет в доме хлеба для детей голодных,
Нет каши, масла, молока...
Устали все от просьб и слез бесплодных,
Замучили всех горе и тоска.
Но терпят все. И молятся усердно.
О, Господи! Все видишь, слышишь Ты.
От гибели спаси нас, Милосердный,
Не дай погибнуть в царстве сатаны.
Уже дошли страданья до предела.
Всем завтра светлый праздник. Только нас
Великая невзгода одолела
И луч надежды навсегда погас.
Но можешь Ты зажечь его, чтоб снова
Стал человеком, а не зверем он.
Чтоб зло ушло навечно из под крова,
Чтоб мертвый был тобою воскрешен.
Ты вс»емогущ, любвеобилен, нежен,
Ты можешь в доме мир восстановить,
Все сделать, чтобы муж был обезврежен,
Чтоб вновь окрепла порванная нить.
Иль Ты пошли кончину нам благую,
Нет больше сил, терпенья больше нет.
Мы примем смерть как гостью дорогую
И как спасенье от нужды и бед.
Жена молилась и молились дети,
Муж здесь же был весь грязный и больной,
Хотел порвать он пагубные сети,
Сплетенные бесстыдным Сатаной
Но как порвать? — Ночуй сегодня дома,
Ведь завтра праздник, в церковь все пойдем...
Заплакал; это детям незнакомо,
И сам себе такой он не знаком.
И в сердце вдруг зашевелилось что-то
Неведомое, теплое и он
В слезах Творцу молился на коленях
И дух упрямства тут был сокрушен,
И он в слезах молился неумело:
Я каторжник, разбойник я, злодей...
Мне жить в грехах и в зверстве надоело —
Верни мне совесть иль сейчас убей!
Я сам не знаю, как случилось это,
Как извергом я стал семье своей,
Моя душа разута и раздета.
О, Господи! Услышь и пожалей!
С Христом возможно все решить задачи,
Лишь от Него и Мир и благодать,
От счастья дети маленькие плачут —
Им хочется скорей отца обнять.
И он берет их на свои колени:
Христос Воскрес! Он громко говорит
И вспыхнул свет, где раньше были тени,
И сразу хмурый изменился вид.
Лев стал овцою кроткой и смиренной.
Вот деньги вам, все деньги в этот раз!
Душа с Христом, не будет больше горя,
Не огорчу ничем я больше вас.
Возможно ль счастье описать такое.
Молились утром мать, отец и все,
Благодаря за счатье неземное,
В слезах все лица как, лучи в росе.
Да! Бог все видит и небезучастен
К людской нужде. Он слышит стон души.
И если ты, мой милый друг, несчастен —
К Нему с печалью сердца поспеши.
Молись Ему в печальное мгновенье,
Проси Его и Он тебя простит.
Он всемогущ, Он верный Избавитель,
Он есть покров души твоей и щит.



Трыфан Уладзіміравіч Лістападаў нарадзіўся ў 1915 годзе. Пражыў нялёгкае жыццё. Інвалід. Страціў у аўтамабільнай катастрофе двух сыноў. Застаўся адзін. Але вера у Бога дапамагае жыць і працаваць. Ён ужо больш 40 гадоў працуе у пазаведамаснай ахове г. Крычава. Зараз ён начальнік участка на ахове аб'яднання «Крычаўцэментшыфер».

Трыфан Уладзіміравіч чалавек вельмі набажны, у кожнае свята наведвае царкву. Яго і паэзія уся прасякнута рэлігійнай тэматыкай.

Фота В.БЫСАВА.

Ірына Васільеўна Даўгалёва нарадзілася ў 1965 годзе. Скончыла Хоцімскую СШ № 1 з залатым медалём, Мінскі тэхнікум сувязі з чырвоным дыпломам. Зараз працуе загадчыцай агульнага аддзела у рэдакцыі газеты «Беларускі Усход». Вершы пачала пісаць у школьныя гады.



Ирина ДОЛГОЛЕВА

ФИЛИН И СИНИЦА

Встречает Филина Синичка,
Он говорит: «Я бестолков,
Ты научи меня, певичка,
Связать красивых пару слов».

— Что ж, хорошо, встаю я рано
И, если Вас устроит в пять,
Я пропою своим сопрано
И вы все сможете понять.

И было так: Синичка пела,
А Филин до ее «тень-тень»,
Сказав «Угу», ходил на дело,
Теперь же знал, что скоро день

И поспешил с лучом рассвета
Скорее спрятаться в дупло,
Не вынося дневного света.
Синице просто повезло.

Она, до песен мастерица,
Тотчас придумала сюжет
И, теньнькув, поспешила скрыться,
Чтобы не съел ее сосед.

***

«Мечтать не вредно — вредно не мечтать...»
Но, к сожаленью, я мечтала мало,
Лишь потому, что рано осознала;
«Рожденный ползать — не рожден летать».

Сам посуди, что б стал ты делать,
Когда бы с разных слышал ты сторон:
— Молчи, ты глуп! Не двигаться! Не бегать!
— Ты что сидишь, молчишь? Ведь ты умён!

А мне не хочется ни к тем, ни к этим.
По лезвию ножа бы мне пройти.
Туда, где нет особенных отметин,
Где мне равны, где равные пути.

И это не мечта, а лишь сознанье
Той истины, что каждому свое,
Что я простое среднее созданье
И не хочу чужого, мне — мое.

ИВАН ПЕХТЕРЕВ

ЛЮБОВЬ

Она измучила меня!
И мучить век не перестанет,
Тревогой ночи, светом дня
Мне да скончанья века станет.
Уйдет, обидев сгоряча,
И снова сердце отуманит
И, как девчонка, хохоча,
Меня счастливого поманит.
Она то вспыхнет, как сирень,
То, как черемуха, увянет,
То даст надежду мне на день,
А то на год возьмет обманет.
А я уйду, — она в кругу
Своих забот меня вспомянет...
Вот так всю жизнь за ней бегу,
Бегу, пока меня не станет.
Но даже там, в стране иной,
Где страсти тела не дурманят,
Моя душа о ней, земной,
О ней грустить не перестанет.
И, может быть, тогда Господь,
Что благодатью миром правит,
Вернет душе былую плоть
И вновь к Любви меня отправит.

ДУМА

Мир был полон подлости и слез —
И пришел Господь к нам как Христос,
Словно брат явился, словно друг,
Чтоб крестом животворящим рук
Оградить нас от посмертных мук.

Он, людей мучительно любя,
Каждый грех их принял на себя.
Святый царь заоблачных небес
На кресте распят был, но воскрес.
Он страдал, чтоб люди всей земли
В нем живом бессмертье обрели.
Только люди — те же лицедеи,
Хамы, воры и прелюбодеи,
Лжесвидетели и кровопийцы,
Сплетники, завистники, убийцы.
Неужель несущий благодать
Должен снова на кресте страдать,
Чтоб спасти нас, аду не отдать?
Эта дума не уходит прочь,
Хоть уже бежит к рассвету ночь.
За окном, где чахнет темнота, —
То ли месяц, то ли нимб Христа.



Малюнак В.САКОВІЧА.

АРКАДИЙ НАЗАРЕНКО

ДАНТЕ АЛИГЬЕРИ

(Сонет)

Суровый Дант не презирал сонета, —
О нем когда-то Пушкин так сказал.
Великий Пушкин очень уважал
Такого же великого поэта.
Суровый Дант — а сколько песен спето
Для Беатриче!.. Как он обожал!..
И сколько ей сладчайших написал,
Нежнейших канонических сонетов!..
Нам лед и пламень не соединить,
Вода и камень не соединимы,
А он, великий, мог их породнить:
Суровость, нежность — стали побратимы,
И Дантовское строгое чело
Нежней нежнейших чувство берегло!

О, ЕСЛИ Б МОГ Я...

(Сонет)

О, если б мог я мощной тучей стать,
С огромными — на небо все — крылами,
Чтоб стал высоко в небе я летать
И над полями и над городами,
Чтоб мог я радость жизни вдохновлять
В сердца людей весенними ветрами.
А боль, неправду, злобу поражать,
Как молнии убийственной огнями, —
Какое б счастье для людей я дал,
Какую б дружбу в людях воспитал
На нашей неустроенной планете!
Я б сделал, чтоб ни горя, ни вреда,
Ни войн, ни зла и ни вражды, ни смерти
Не знали больше люди никогда!



ПОНЕДЕЛЬНИК, 21 сентября

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ ПОКАЗЫВАЕТ МОГИЛЕВ

18.00 ДЕНЬ ОБЛАСТИ.
18.15 ГОРЯЧАЯ ТЕМА. ЧТО ПРОИСХОДИТ В НАШЕЙ ЭКОНОМИКЕ!
19.00 Областные новости (Брест).
19.10 МЭТА.
20.10 Док. фильм. (Китай).
20.25 Фильм для детей. «Хороший мальчик». 3-я серия.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.25 Спортивный телекурьер.
21.50 «Песни Западного Китая». Муз. фильм. 3-я серия.
22.20 «Спутник «Великий поход» взлетает сегодня вечером». Худ. фильм. 1-я серия.
23.10 НИКа.

ПЕРВЫЙ КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.30 «Утро».
7.50 Мультфильм.
8.00 Новости.
8.20 «Брэйн ринг».
17.00 Новости.
17.20 «Футбольное обозрение».
17.50 «НЭП».
18.20 Худ. фильм. «Что посеешь...»
19.45 Спокойной ночи, малыши.
20.00 Новости.
20.40 «Когда мы были молодыми...» По страницам передачи «Театральные встречи».

«Новая студия» представляет:

21.10 «Будка гласности».
21.20 «Проект 30».
21.45 «Однако».
22.00 «Кривой эфир».
22.15 «Бомонд».
22.30 «Джем-сейшн». В перерыве (23.00) — Новости.

ВТОРНИК, 22 сентября

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

18.00 Студия «Тэлесябрына».
18.25 Футбол. Чемпионат Беларуси. «Динамо» (Минск) — «Беларусь» (Минск). В перерыве (19.15) — Областные новости (Витебск).
20.20 Фильм для детей. «Хороший мальчик». 4-я серия.
20.45 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.25 Телебиржа.
21.35 Док. фильм. (Китай).
21.50 «Танец Западного Китая». Муз. фильм. 1-я серия.
22.20 «Спутник «Великий поход» взлетает сегодня вечером». Худ. телефильм. 2-я серия. (Китай).
23.15 НИКа.
23.30 Футбол-92. Чемпионат Беларуси. «Ведрич» (Речица) — «Днепр» (Могилев). 2-й тайм.

ПЕРВЫЙ КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.30 «Утро».
7.50 Мультфильм.
8.00 Новости.
8.20 «Богатые тоже плачут». Худ. телефильм.
9.05 «Футбольное обозрение».
17.00 Новости.
17.25 Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет.
18.00 «Богатые тоже плачут». Худ. телефильм.
18.45 «Миниатюра». Муз. программа.
19.00 «Тема».
19.45 Спокойной ночи, малыши.
20.00 Новости.
20.35 Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет. III международный конкурс популярной музыки и песни. «Голос Азии».
22.05 «За Кремлёвской стеной».
22.30 Авторалли Париж-Москва-Пекин.
23.00 Новости.
23.25 «Любовь с первого взгляда». День первый.

СРЕДА, 23 сентября

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ ПОКАЗЫВАЕТ МОГИЛЕВ

18.00 ДЕНЬ ОБЛАСТИ.
18.10 НАКАНУНЕ СЕССИИ ОБЛАСТНОГО СОВЕТА. ЗЕМЕЛЬНАЯ РЕФОРМА.
18.30 Какие мы хозяева! Рыночные отношения на Могилевском автозаводе и «Могилевсельмаше».
19.00 Областные новости (Гомель).
19.10 «Пять звезд». Телеигра.
20.10 Фильм для детей. «Хороший мальчик». 5-я серия.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.25 Док. фильм. (Китай).
21.45 «Танцы Западного Китая». Муз. фильм. 2-я серия. (Китай).
22.15 «Спутник «Великий поход» взлетает сегодня вечером». Худ. телефильм. 3-я серия. (Китай).
23.15 Закрытие недели Сычуаньского телевидения.
23.45 НИКа.

ПЕРВЫЙ КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.30 «Утро».
7.50 Мультфильм.
8.00 Новости.
8.20 «Богатые тоже плачут». Телефильм.
17.00 Новости.
17.20 Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет.
17.50 Премьера док. фильма «Игорь Ноткин. Философ нищеты».
18.00 «Богатые тоже плачут». Телефильм.
18.40 «Кинопанорама».
19.45 Спокойной ночи, малыши.
20.00 Новости.
20.40 «Они готовы жить иначе», Встреча В.Познера с молодёжью в студии «Останкино».
23.00 Новости.
23.25 «Любовь с первого взгляда». День второй.

ЧЕТВЕРГ, 24 сентября

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

17.55 Иснасць. Духовно-религиозная программа.
18.55 Зачитайте моё письмо...
19.00 Областные новости (Гродно).
19.10 Как начать собственное дело. Диалог американских бизнесменов.
19.40 Три кита.
20.25 Неделя белорусского правительства.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Творческое молодёжное объединение «Крок» представляет...
23.00 НИКа.
23.15 Открытие Дней Республики Болгария в Беларуси.

ПЕРВЫЙ КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.30 «Утро».
7.50 Мультфильм.
8.00 Новости.
8.20 «Богатые тоже плачут». Телефильм.
17.00 Новости.
17.20 «...До шестнадцати и старше».
18.20 «Богатые тоже плачут». Телефильм.
18.45 «Музыка в эфире». Часть 1-я.
19.45 Спокойной ночи, малыши.
20.00 Новости.
20.35 Лото «Миллион».
20.50 Фильмы режиссера А.Вайды. «Пепел и алмаз».
22.30 Авторалли Париж-Москва-Пекин».
23.00 Новости.
23.25 «Музыка в эфире». Часть 2-я.

ПЯТНИЦА, 25 сентября

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

18.00 Док телефильм.
18.20 ОБЛАСТНЫЕ НОВОСТИ (МОГИЛЕВ).
18.30 1000-летие Полоцкой епархии и Православной церкви на Беларуси. В перерыве (19.45) — Колыбельная.
21.35 Панорама.
22.00 Телебиржа.
22.15 Киноностальгия. «Машенька». Худ. фильм.
23.30 НИКа.

ПЕРВЫЙ КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.30 «Утро».
7.50 Мультфильм.
8.00 Новости.
8.20 «Богатые тоже плачут». Телефильм.
9.05 «Клуб путешественников».
17.00 Новости.
17.25 Мультфильм.
17.35 «Человек и закон».
18.05 Телефильм для детей «Приключения Черного красавчика». 11-я серия.
18.30 «Максима».
19.00 «Поле чудес».
19.45 Спокойной ночи, малыши.
20.00 Новости.
20.40 Худ. фильм «Мышеловка».

ВиД представляет:

22.05 «Музобоз».
22.40 «Отдыхай».
22.45 «Программа Икс».
00.00 «Музыкальный час». «Площадка «Обоза». В перерыве (23.00) — Новости.
01.00 «Марица». Худ. телефильм.

КАНАЛ «РОССИЯ»

22.30 На сессии ВС Российской Федерации.
23.00 Из зала Конституционного суда России.
23.30 «К-2» представляет: «Ореховый хлеб». Худ. фильм.

СУББОТА, 26 сентября

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.30 Утро республики.
8.45 «Война и мир». Худ. фильм. 2-я серия. «Наташа Ростова».
10.20 МЭТА.
11.00 Неделя планеты.
11.15 Показывает Брест.
12.15 Памятники рассказывают. Представляют тележурналисты Санкт-Петербурга.
12.25 20 минут редактора.
12.45 Экономический телевестник.
13.05 «Крыша». Творческая мастерская «Кола».
13.35 Говорим по-белорусски.
14.00 «Благословенный Витебск».
15.20 Для детей. Семь цветов радости.
15.55 Футбол. Чемпионат Беларуси. «Торпедо» (Минск) — «Динамо» (Минск).
17.50 Док. телефильм.
18.40 На музыкальных параллелях.
19.40 Бизнесклуб «Партнер». Благотворительный телеаукцион в г.Орша.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.25 Телебиржа.
21.35 Худ. фильм «Мужчина и женщина». (франция).
23.00 НИКа.
23.15 Футбол. Чемпионат Беларуси. «Химик» (Гродно) — КИМ (Витебск). 2-й тайм.
00.05 Футбол-92. Результаты тура.

ПЕРВЫЙ КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

6.30 «Субботнее утро делового человека».
7.30 «Спорт-шанс».
8.00 «Марафон-15» — малышам».
8.25 «НЛО: необъявленный визит».
8.55 «Радио «Труба». Развлекательная программа.
9.25 «Медицина для тебя».
10.05 «ЭХ». Экологическая хроника.
10.20 Легкая атлетика. Кубок мира.
11.15 Документальный фильм «Нам и потомкам». кам».
12.20 «Щит и меч России». Концерт, посвящённый 60-летию российской прокуратуры.
13.10 Телефильм «Легенда «Боинга». Фильм 2-й.
14.00 Новости.
14.25 «Крещендо». Муз. программа.
14.40 «В мире животных».
15.40 «Красный квадрат».
16.20 «Еноты». Мультфильм.
16.45 Худ.фильм «Волчонок среди людей».
18.05 Футбол. Чемпионат России. «Спартак» (Москва) — «Динамо» (Москва).
19.45 Спокойной ночи, малыши.
20.00 Новости.
20.35 «КВН-92». Международная встреча сборной команды КВН СНГ и сборной университетов Израиля.
22.35 «Европа плюс». В перерыве (23.00) — Новости.
23.50 «Ночной канал «Сно-видение».

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00 Вести.
7.20 Дорога к храму. «Миряне».
7.40 Тема с вариациями. «Дом друзей».
8.00 «Мир спорта глазами фирмы «Жиллетт».
8.30 Программа «03».
9.00 Ретро. Клавдия Шульженко.
9.30 Российская энциклопедия. Сергей Радонежский. Фильм 1-й.
10.00 «Плюс одиннадцать».
11.15 «Как жить будем!»
12.00 Российское бюро путешествий.
13.00 Вести.
13.20 «Сказка, рассказанная ночью». Худ. фильм.
14.35 «Бурда моден» предлагает...»
15.05 Сам себе режиссер.
15.35 Россия и мир.
16.05 «Давайте пожмём друг другу руки...» Н.Никитский.
17.25 Фестиваль московских галерей.
17.55 Парламентский вестник.
18.10 Театральный разъезд. «Играем премьеру».
19.00 Вести.
19.25 Праздник каждый день.
19.35 Музыкальная деревня.
20.10 «Кинг Сайз». Худ. фильм.
22.00 Вести.
22.20 Программа «А».

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 27 сентября

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.30 Утро республики.
8.40 Программа передач.
8.45 «Война и мир». Худ. фильм. 3-я серия. «1812 год».
10.05 Уроки здоровья.
10.35 Удивительный мир.
11.35 Мультфильм.
12.35 Павел Глоба: ваше имя.
13.30 Час письма.
14.00 Поэтическая гостиная.
14.10 «Возрождение».
14.50 «Суперкнига». Мультфильм.
15.25 Празднование 1000-летия Православной церкви на Беларуси в Заславле.
16.00 Гандбол. Женщины. Кубок 1/16 финала. «Политехник» (Минск) — «Автомобилист» (Украина).
17.20 Ищем инициативных.
17.40 «Опасно для жизни». Худ. фильм.
19.10 Наш гость — шеф-редактор газеты «Знамя юности». писатель М.Катюшенко.
20.00 Панорама.
20.25 Мультфильмы для взрослых.
20.40 Колыбельная.
21.00 Каскад.
21.15 Студия «Тэлесябрына». «Пепси-ТОП-20». Передача 2-я.
21.50 Худ. фильм «Мужчина и женщина через 20 лет». (Франция).

ПЕРВЫЙ КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

7.00 Тираж «Спортлото».
7.15 Телефильм «На кого мне обижаться».
7.45 «Охранная грамота». «Дивное диво».
8.15 «С утра пораньше».
9.15 «Новые имена».
9.55 «Киноафиша».
10.10 Легкая атлетика. Кубок мира.
13.05 «Авиакосмический салон».
11.20 «Хит-топ-шоу 50х50».
12.50 «Метаморфозы живописи».
14.00 Новости.
14.20 «Диалог в прямом эфире».
15.00 Клуб путешественников.
15.50 Играет лауреат международных конкурсов П.Нерсесьян.
16.00 Панорама.
16.40 «Телелоция».
16.55 «Уолт Дисней представляет...»
17.45 Новости.
18.05 «Единого слова ради...» Муз. повествование.
18.30 Слово о театре М.Ульянова. А.П.Чехов — «Вишневый сад». Премьера телеспектакля.
21.00 «итоги».
21.45 «Спортивный уик-энд».
22.00 «Ныне». Религиозная программа.
23.00 Новости.
23.25 Авторалли Париж-Москва-Пекин».
23.55 «Утренняя звезда» в ночном эфире».

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.40 «Вот город Борисоглебск».
8.10 Развлекательная программа.
8.40 «Аляска».
9.30 Худ. фильм «Для вас, девчонки и мальчишки».
9.40 «Гроза 1812 года». Фильм 6-й.
10.10 «Приключение в королевстве». Кукольный мультфильм.
10.40 Аты-баты...
11.10 Зигзаг удачи.
11.40 Мультфильм «Дораэмон».
12.00 XX век в кадре и за кадром.
13.00 Вести.
13.20 Складчина.
13.50 «Виндзорские проказницы» с антрактом в Выборге.
14.45 Автогонки. Гран-при «Формула-1».
17.15 Антракт.
17.30 «Звезды Америки».
18.00 Мастера. «Мой тяжкий крест».
19.00 Вести.
19.20 Праздник каждый день.
19.30 Клуб «Желтая подводная лодка».
19.55 Фильмы Голливуда. «Я видел Париж в последний раз».
22.00 Вести.
22.20 Спортивная карусель.

СОВЕТЫ ХОЗЯЙКЕ

СЛИВЫ СУШЕНЫЕ

Созревшие неповрежденные сливы моют, опускают на 5 секунд в горячий (95-97°) раствор питьевой соды (на 1 л воды 1 стол. ложка соды) и снова моют под струей воды. Дав стечь воде, сливы раскладывают на противни и сушат на солнце. В печах же ведут сушку в два приема. Вначале в легкой печи (40-50°) в течение 3-4 часов, затем вынимают и выдерживают на воздухе 4-5 часов. После этого сушку ведут 10-12 часов в печи при температуре 55-60°, до полного высушивания. Высушенные сливы должны быть мягкими, но упругими.

СЛИВЫ — ЛЕКАРСТВО

В народной медицине плоды сливы применяют как диетическое и терапевтическое средство при атеросклерозе, ревматизме, при болезнях почек и печени, а также при желудочных и кишечных заболеваниях.

На одном из островов в Тихом океане обнаружено племя, которое не знало болезней. Островитяне очень много едят слив.

Причем никогда их не моют, едят только с сизыми налетом, который бывает на хорошо созревших и перезревших сливах.

У жителей острова в меню почти круглый год сушеные сливы.

ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЯ

УВАГА, ЛЮДЗІ І НАЧАЛЬНІКІ!

Зялёны чай паскарае вывад з арганізма радыёнуклідаў. Рэгулярнае ўжыванне зялёнага чаю прадухіляе захворванне ракам.

Грамадзяне! Патрабуйце ад мясцовых улад і гандлёвых работнікаў, якія ведаюцмь завозам тавараў, каб на паліцах магазінаў у раёнах Беларускага Усходу заўсёды было дастаткова для пакупнікоў зялёнаг чаю, бо ў нас нават у «чыстых» раёнах, як Хоцімскі, Мсціслаўскі Горацкі, не выключана, што ў харч могуць трапіць радыёнукліды. Таму нам усім ва ўсходняй Беларусі, ды і ва ўсёй Рэспубліцы, кожнаму патрэбен зялёны чай!

Кіраўнікі раёнаў! Паклапаціцеся пра здароўе сваіх грамадзян. Бог вас за гэта шмат грахоў здыме. А іх у вас хапае.

Базыль ЗНАХАР.

АРКАДИЙ НАЗАРЭНКО

МИНИАТЮРЫ

НЕГАТИВИЗМ

Он на словах как реформатор,
на самом деле — консерватор.
Где надо дать бы — он берет...
Все у него наоборот!

ЗНАКОМСТВО

Вот этот — «славный» человек,
«прославлен» в баснях он навек,
с начальством может чудеса...
Хамелеон он и лиса!

ИЗОБРЕТАТЕЛЬ

«Работал» он не год, не два...
аж полысела голова.

За много лет ученый дед
вдруг изобрел... велосипед!

Галоўны рэдактар В. А. ДАЎГАЛЕЎ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Для пісьмаў: 213670, Хоцімскі раён, п/а Трасціно, в.Маркаўка, д.35. Тэлефоны: галоўнага рэдактара — 22-9-89, намесніка гал. рэдактара — 2-20-09, карэспандэнцкага пункта ў Касцюковічах 21-6-94, ў Клімавічах: 2-11-60; у Мсціслаўлі 5-09-27, у Крычаве 2-13-64. у Слаўгарадзе 2-13-73, 2-16-96.

Газета падпісана да друку ў 18 гадзін.

Заснавальнікі: Крычаўскі гарадскі Савет народных дэпутатаў і працоўны калектыў рэдакцыі.

«Белорусский Восток». На белорусском и русском языках. Независимая общественно-политическая, литературно-художественная и религиозно-моральная газета. Выходит по субботам.

Індекс 64098 Газета набрана и отпечатана в Могилевской областной типографии ул.Первомайская, 70. Тыраж 916 экз. Цана 2 руб. 50 кап. Аб'ём 1 друк. аркуш. Зак. 25.